С.В.Аўдзей,
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

# УЗАЕМАСУВЯЗЬ ТЭАРЭТЫЧНАГА І ПРАКТЫЧНАГА КАМПАНЕНТАЎ У ВУЧЭБНЫМ ПРАЦЭСЕ

Праблема ўзаемасувязі тэарэтычных і практычных кампанентаў вучэбнага працэсу пры падрыхтоўцы студэнтаў ВНУ да практыкі, а таксама ў перыяд самой практыкі мае некалькі ўзроўняў. Таму гэтая праблема патрабуе сістэмнага падыходу да яе вырашэння.

Па-першае, пры разглядзе суадносін паміж тэарэтычнай часткай навучання і практыкай як яе вынікам нельга забываць, што студэнцкая практыка — таксама вучэбны працэс, што асноўная функцыя практыкі — адукацыйная. У працэсе практыкі набываюцца новыя веды, уменні, навыкі.

У апошні час адносіны студэнтаў да будучай прафесійнай дзейнасці набываюць характар прагматызму. Больш таго, на сённяшні дзень студэнты імкнуцца не прапусціць магчымасці папрацаваць. Але зняцце "акадэмічнай" ізаляванасці студэнта ў час навучання, яго разгорнутасці да практыкі, на жаль, не заўсёды азначае павышэнне прафесіяналізму, не заўсёды ідзе на карысць агульнай прафесійнай падрыхтоўцы яго да будучай дзейнасці.

У добра арыентаваных студэнтаў практычны накірунак спадарожнічае ўсёй вучэбнай дзейнасці. Аднак даволі часта імкненне да вытворчай практыкі мае характар практыцызму, што ў сваю чаргу прыводзіць да зняважлівых адносін да тэарэтычных дысцыплін і агульнага працэсу набыцця ведаў. Некаторыя ж студэнты, у якіх не вельмі добрыя вынікі вучобы, маюць надзею выправіць становішча, павысіць свой статус і самаадзнаку ў ходзе практыкі, але "ў такіх студэнтаў заўсёды ўзнікае расчараванне, калі яны распачынаюць канкрэтную практычную дзейнасць". Гэтае расчараванне звязана з недастатковымі тэарэтычнымі ведамі, адсутнас-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цю ўменне аналізаваць свае дзеянні, прагназаваць вынікі сваёй працы.

На нашу думку, можна выкарыстаць вопыт замежных вучоных, якія лічаць неабходным весці дадатковую работу па падрыхтоўцы студэнтаў да практыкі і маюць своеасаблівы погляд на сутнасць і працэс самой практыкі, месца і функцыі кіраўніка практыкі. Практыка ўспрымаецца імі як прадаўжэнне вучэбнага працэсу, а адрозненне ад заняткаў ва аўдыторыі заключаецца ў тым, што навучанне праходзіць у кантэксце базы практыкі, прафесійнай дзейнасці. Таму студэнт і выкладчык вышэйшай навучальнай установы пастаянна абмяркоўваюць, аналізуюць, чаму навучыўся студэнт пасля папярэдняй сустрэчы з выкладчыкам, які вопыт ён выкарыстоўваў, ці лепшы гэты вопыт, выяўляюць, чаго не ведае студэнт. У абавязкі выкладчыка ўваходзіць аказанне дапамогі ў падборы тэарэтычнага матэрыялу, які здыме праблемы практычнага характару, што ўзніклі ў студэнта. Выкладчык нясе адказнасць перад навучальнай установай за пашырэнне і ўдасканальванне ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў у ажыццяўленні прафесійнай практычнай дзейнасці.

Такім чынам, успрымальнасць вучэбнай і вытворчай практыкі як набыццё новых ведаў, уменняў і навыкаў, а не толькі замацаванне тых, з якімі студэт прыйшоў на практыку, патрабуе ад выкладчыкаў і студэнтаў больш сур'ёзных адносін да тэорыі і адначасова павышае эфектыўнасць практыкі.

Па-другое, для павышэння якасці вынікаў практыкі па-трабуецца ўдакладненне суаднесенасці тэарэтычных ведаў, якія атрымлівае студэнт у вышэйшай навучальнай установе, мэтам і зместу практыкі. Напрыклад, пры падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў прадугледжваюцца практыкі на кожным курсе. Практыка на I курсе прадбачвае прапрацоўку студэнтамі некаторых этычных дылем ў рабоце сацыяльнага педагога, праверку ўмення прафесійна будаваць адносіны з людзьмі рознага ўзросту, сацыяльнага статусу, асабістых якасцей. Тэарэтычнай асновай для правядзення гэтай практыкі з'яўляюцца вучэбныя курсы "Уводзіны ў спецыяльнасць",

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Агульная псіхалогія” (раздзел “Псіхалогія асобы”), “Узроставая псіхалогія”. Практычныя навыкі, напрыклад, валоданне голасам, целам, студэнтамі набываюцца ў курсах “Сцэнічная мова”, “Рэжысура” (раздзел “Выканаўчы трэнінг”). Як сродак для падрыхтоўкі да практыкі з'яўляецца і экзамен па “Ўводзінах у спецыяльнасць”, які праводзіцца ў форме круглага стала, дзе студэнт не толькі дакладвае тэарэтычны і практычны матэрыял, атрыманы ім ва аўдыторыі і ў перыяд самастойнай працы, але і абавязаны прадэманстраваць валоданне правіламі выступлення перад аўдыторыяй і вядзення дыскусіі. На II і III курсах ідзе замацаванне ведаў асноў тэхналогіі культурна-адпачынкавай дзейнасці з улікам асаблівасцей узросту аўдыторыі (II курс — работа з дзецьмі, III курс — работа з дарослымі). На якасць дзейнасці студэнтаў на практыцы II курса, акрамя спецыяльных прадметаў, аказваюць уплыў у першую чаргу такія агульнанавуковыя курсы, як “Узроставая псіхалогія”, “Педагогіка”. З заданнямі практыкі III курса студэнты справяцца, калі будуць абапірацца на тэарэтычныя канцэпцыі ў галіне сацыяльнай педагогікі, сацыялогіі, сацыяльнай псіхалогіі, мадэліравання культурна-адпачынкавых праграм і інш. Для паспяховага праходжання вытворчай практыкі IV курса і пераддыпломнай практыкі V курса студэнты рыхтуюць усе вывучаемыя імі тэарэтычныя спецыяльныя прадметы. Ім неабходна ведаць законы развіцця складаных соцыумаў, улічваць сацыяльныя, узроставыя, псіхалагічныя асаблівасці, валодаць уменнем працаваць у стрэсавай сітуацыі, набыць уменні і навыкі ацэнкі і планавання сваёй работы, прадугледжваць доўгатэрміновыя вынікі сваёй дзейнасці і інш. Безумоўна, працы ў накірунку ўдакладнення зместу практык, пераліку ведаў, уменняў і навыкаў для дадзенай спецыяльнасці шмат, але ўжо ёсць і зрухі ў бок павышэння грунтоўнасці падрыхтоўкі студэнтаў да практыкі (напрыклад, студэнты III курса працуюць з вялікімі групамі людзей, і ім патрэбна паглыбленае валоданне метадамі сацыялагічных даследаванняў. Пасля абмеркавання пытання на кафедры быў уведзены спецкурс, які студэнты выкарыстоўвалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не толькі на практыцы III курса, але і пры падрыхтоўцы курсавой работы, што завяршае трохгадовы цыкл прадмета “Тэхналогія сацыякультурнай дзейнасці”).

Магчыма, ёсць сэнс уключаць у праграму практыкі абавязковае патрабаванне да неабходнасці выкарыстання розных тэарэтычных мадэляў з улікам асаблівасцей базы практыкі. Тэарэтычнае абгрунтаванне практычнай дзейнасці патрабуе абавязковага замацавання на заключнай канферэнцыі, а таксама ў курсавых і дыпломных праектах, на экзаменах.

Для павышэння ўзроўню навукова-тэарэтычнага асэнсавання вынікаў дзейнасці студэнта ў перыяд практыкі лічым мэтазгодным праводзіць канферэнцыі, дзе студэнты не проста пералічваюць мерапрыемствы, праведзеныя імі ў перыяд практыкі, а даюць тэарэтычнае абгрунтаванне аднаму з бакоў іх будучай прафесійнай дзейнасці. У каментарыях вынікаў практыкі кіраўнік павінен абавязкова даваць прапановы па далейшым прафесійным росце кожнага студэнта. Магчымасць даваць такія прапановы патрабуе ад выкладчыка глыбокіх ведаў сутнасці прафесіі, заканамернасцей фарміравання прафесійна значных асобасных якасцей, а таксама законаў засваення студэнтамі ведаў і уменняў.

Таму не вельмі добрая традыцыя разглядваць гадзіны практыкі як дадатак да гадзін асноўных курсаў. Для павышэння якасці правядзення практыкі неабходна замацаванне асобных відаў практыкі за тымі выкладчыкамі, якія вядуць асноўныя тэарэтычныя і практычныя курсы. Пры такім падыходзе да падрыхтоўкі студэнта да практыкі можна будзе ў далейшым дзейсна весці профільнае чытанне агульнанавуковых курсаў, устанаўленне рэальных міжпрадметных сувязей.

Усе шляхі сутыкнення тэорыі з дзейнасцю студэнта ў перыяд практыкі дазваляюць фарміраваць у яго здольнасць асэнсавана выкарыстоўваць свой вопыт і вопыт калег, прымаць новыя веды, аналізаваць прапануемыя падыходы да вырашэння тых ці іншых прафесійных задач.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па-трэцяе, мы не заўсёды дакладна псіхалагічна рыхтуем студэнта да практыкі. Вядучы амерыканскі навуковец у галіне кіравання практыкай А.Кадушкін падкрэслівае, што студэнт лепш засвойвае на практыцы веды, уменні, навыкі, калі ён не толькі суадносна матываваны, але і ў тым выпадку, калі студэнту не патрэбна расходаваць энэргію на спробу адолець трывогу, справіцца са страхам не выканаць задачы практыкі і інш.

Верагодна, ёсць сэнс выдзяляць у тэарэтычных курсах некалькі гадзін, дзе неабходна разглядаць наступныя пытанні практыкі:

— што ўжо ведае студэнт да пачатку практыкі;

— чаму неабходна навучыцца студэнту ў перыяд практыкі (а не толькі замацаваць ужо набытыя ім уменні і навыкі);

— чаму жадае навучыцца сам студэнт;

— якім чынам ён хоча навучыцца гэтаму: праз метад проб і памылак, імітацыяй, праз канцэптуалізацыю або выкарыстоўваючы разам усе метады.

Вынікам гэтага з'явіцца стварэнне індывідуальнай праграмы работы студэнта, з якой ён будзе дакладна ведаць тое кола новых ведаў, уменняў і навыкаў, якое яму патрэбна будзе прадэманстраваць пасля заканчэння практыкі.

Такім чынам, гаворачы аб узаемасувязі тэарэтычных і практычных кампанентаў і іх месцы ў рабоце студэнтаў у перыяд практыкі, можна подкрэсліць, што

— тэарэтычны кампанент падрыхтоўкі патрэбна ўлічваць у перыяд практыкі;

— пажадана праблему месца тэарэтычнага кампанета ў практычнай падрыхтоўцы студэнта вырашаць, абапіраючыся на ланцужок: заняткі ва аўдыторыі — заняткі на практыцы — курсавыя (дыпломныя) работы — тэарэтычнае абагульненне вынікаў практыкі на заключнай канферэнцыі па практыцы — тэарэтычная частка экзамену па спецпрадметах;

— адной з вядучых частак метадычнай працы выкладчыкаў з'яўляецца абгрунтаванне базавых ведаў, уменняў і навы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каў, неабходных для прафесійнай падрыхтоўкі, якія будуць замацоўвацца на практыцы. Так пабудаваная метадычная праца дазволіць надаць базавым ведам, уменням і навыкам сістэмны характар, пазбегнуць неапраўданых паўтораў у розных вучэбных курсах;

— павышэнне суб'ектыўнай значнасці тэарэтычнага кампанента ў падрыхтоўцы студэнта будзе лепш ажыццяўляцца, калі для кожнага студэнта па кожным відзе практыкі будзе стварацца індывідуалізаваная праграма з улікам аб'ектыўнага ўзроўню падрыхтоўкі студэнта і яго пажаданняў;

— павышэнне якасці правядзення практык можа мець месца пры замацаванні за канкрэтнымі групамі выкладчыкаў таго ці іншага віду практыкі.

**В.М.Бігеза,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАГА МАЙСТЭРСТВА БІБЛІЯТЭКАРАЎ, ЯКІЯ АБСЛУГОЎВАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ

Сучасныя патрабаванні да ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў культуры вышэйшай кваліфікацыі, павышэння ўзроўню іх прафесійнай гатоўнасці абумоўліваюць актуальнасць праблемы фарміравання прафесійнага майстэрства будучага бібліятэчнага работніка ў працэсе навучання ва універсітэце. Бібліятэчная адукацыя павінна адпавядаць патрабаванням бібліятэчнай справы, адлюстроўваць яе сучасны стан і перспектывы развіцця. Бібліятэчная практыка — састаўная частка вучэбнага працэсу, аснова бібліятэчнай адукацыі. Такім чынам, у наяўнасці цесная ўзаемасувязь паміж навучаннем і практыкай у падрыхтоўцы спецыялістаў, якія валодаюць сапраўды прафесійным майстэрствам. Паняцце "прафесійнае майстэрства" разглядаецца ў псіхолага-педагагічных даследаваннях шматгранна. Мне бліжэй думка тых наву-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ